View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE

# ФИЛОЛОГИЯ

УДК 81’282.2 (476.7)

## ФАНЕТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ГАВОРАК ВЕРХНЯГА НАД’ЯСЕЛЬДЗЯ

***А.А. БОСАК[1], В.М. БОСАК[2]***
*[1]Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларуст, bosakalena@tut.by*
*[2]Палескі дзяржаўны універсітэт,*
*г. Пінск, Рэспубліка Беларусь, bosak1@tut.by*

Полесгу

### УВОДЗІНЫ

Памежжа Брэсцка-Пінскага Палесся, яго гаворкі, матэрыяльная і духоўная культура насельніцтва знаходзіцца ў цэнтры ўвагі даследчыкаў ужо значны час. Аднак цікавасць да гэтага рэгіёна не толькі не спадае, а, наадварот, павялічваецца, у тым ліку і ў апошнія гады. Пры гэтым зона моўных міждыялектных кантактаў і дыялектных ўзаемаўплываў Брэсцка-Пінскага Палесся і Панямоння, куды і адносіцца тэрыторыя Верхняга Над’ясельдзя (Пружанскі раён Брэсцкай вобласці і яго сумежжа), з’яўляецца вельмі цікавай для правядзення мовазнаўчых даследаванняў. Сумежныя гаворкі адрозніваюцца разнастайнасцю мясцовых асаблівасцей, даследаванне якіх мае важнае значэнне для гісторыі і развіцця беларускай мовы і іншых славянскіх моў [1–8].

### МЕТОДЫКА І АБ’ЕКТЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

Фактычны матэрыял збіраўся на тэрыторыі Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці (асноўная частка даследавання) і на сумежнай тэрыторыі Бярозаўскага, Івацэвіцкага, Камянецкага, Кобрынскага раёнаў Брэсцкай вобласці, Ваўкавыскага, Зэльвенскага, Свіслацкага і Слонімскага раёнаў Гродзенскай вобласці. Усяго абследаваны гаворкі жыхароў 231 населенага пункта, з іх у Пружанскім раёне – 214, Бярозаўскім – 6, Свіслацкім – 5, Ваўкавыскім – 1, Зэльвенскім – 1, Івацэвіцкім – 1, Камянецкім – 1, Кобрынскім – 1, Слонімскім раёне – 1 населены пункт.

Апытванне праводзілася па спецыяльна распрацаванай праграме, якая ўключала 40 пытанняў па фанетыцы. Па выніках праведзеных даследаванняў складзена 30 фанетычных карт [2–3].

У дадзенай рабоце пры аналізе фанетыкі разглядаюцца асобныя асаблівасці вакалізму і кансанантызму, якія дазваляюць вылучыць даследуемыя гаворкі Верхняга Над’ясельдзя як у параўнанні з нарматыўнай беларускай мовай, так і паміж сабой. Фанетычныя асаблівасці, тоесныя з літаратурнай беларускай мовай, у дадзенай рабоце дэталёва не разглядаюцца, так як яны дастаткова поўна адлюстраваны ў іншых навуковых працах.

У сістэме вакалізму разглядаецца рэалізацыя этымалагічных (гістарычных) гукаў у даследуемых гаворках; паказваецца пашырэнне галосных, якія вымаўляюцца на месцы былых гістарычных гукаў; апісваюцца словаформы, у якіх прадстаўлены адпаведныя галосныя гукі.

Кансанантызм апісваецца ў наступным парадку: мяккасць, «паўмяккасць» і цвёрдасць зычных гукаў, якія разглядаюцца наступнымі групамі: губныя [б], [п], [м], [в], зубныя /пярэднеязычныя/ [л], [з], [с], [н], [д], [т] і мяккія [дз’], [ц’], заднеязычныя [г], [к], [х], зычны [р], шыпячыя [ж], [ч], [ш], зычны [ц], губны [ў] /нескладовы/, асіміляцыя па глухасці, фанетычнае падаўжэнне, прыстаўныя /пратэтычныя/ гукі [в], [г].

### ВЫНІКІ І ІХ АБМЕРКАВАННЕ

***Вакалізм.*** **Галосны а.** Вядомы ўсім даследуемым гаворкам. Этымалагічны гук ***а** захаваўся ва ўсіх гаворках: *траве́, брато́к, замо́к*.

Найбольш шырока галосны **[а]** ўжываецца ў гаворках паўночнай і заходняй частак Пружанскага раёна. Тут ён вымаўляецца ў наступных пазіцыях: у пераднацiскных складах на месцы этымалагічнага ***о** пасля цвёрдых зычных: *галава́, малако́*; у першым складзе перад націскам на месцы этымалагічных ***е**, ***Ѣ** пасля губных зычных: *м’ашо́к, машо́к, в’адро́, вадро́, в’асна́, васна́*; у

першым пераднацiскным складзе ў адпаведнасцi з былым ***е** пасля пярэднеязычных ***д**, ***т**, ***з**, ***с**, ***н**: *з’амл’á, с’астрá*; на месцы былога ***ę** ў ненацiскных складах: *с’адз’éў, зл’акáўс’а, зáйац*.

У некаторых гаворках на захадзе на месцы ***е** ў першым пераднацiскным складзе пасля пярэднеязычных ***з**, ***с** вымаўляецца гук сярэднi памiж **[а]** i **[е]**: *з’а$^{е}$мл’á, с’а$^{е}$стрá*.

У слове ‘пята’ галосны **[а]** ўжываецца на месцы былога ***ę** ў пераднацiскным складзе ў большасцi гаворак даследуемага рэгiёна (за выключэннем гаворак невялiкай паўднёва-заходняй часткi рэгiёна i астраўной гаворкi в. Вiтараж): *п’атá, пйатá*.

У словах ‘бераг’, ‘вечар’ **[а]** вымаўляецца ў паслянацiскных складах у гаворках паўночнай часткi i ў некаторых гаворках на захадзе рэгiёна: *в’éчар, б’éраг, вэ́чар, бэ́раг*.

У прыназоўнiку-прыстаўцы ***пад, пад-*** галосны **[а]** вымаўляецца ў гаворках паўночнай i заходняй частак вывучаемага рэгiёна: *пад лáўкай, пад лáўкайу, падн’алá*.

Галосны **[а]** таксама пашыраны ва ўжываннi ў даследуемых гаворках прылягаючых Свiслацкага, Ваўкавыскага, Зэльвенскага, Слонiмскага i Iвацэвiцкага раёнаў. Тут ён вымаўляецца на месцы ***о** ў пераднацiскных складах пасля цвёрдых зычных: *малакó, галавá*; у адпаведнасцi з этымалагiчнымi ***е**, ***ѣ** ў першым пераднацiскным складзе пасля губных: *м’ашóк, в’адрó*; на месцы ***е** ў першым пераднацiскным складзе пасля пярэднеязычных ***д**, ***т**, ***з**, ***с**, ***н**: *з’амл’á, с’астрá*; на месцы былога ***ę** ў ненацiскных складах: *с’адз’éў, гл’адз’éў, зáйац*.

**Галосны о.** Этымалагiчны ***о** захоўваецца ў пераднацiскных i паслянацiскных складах пасля цвёрдых зычных у большасцi гаворак, у прыватнасцi цэнтральнай, паўднёва-ўсходняй, паўднёвай i паўднёва-заходняй частак даследуемага рэгiёна, а таксама на поўначы ў гаворках в. Ласасiн (Палешукi) i в. Вiтараж: *головá, молокó, дорóга*. Таксама галосны **[о]** вымаўляецца ў вышэй адзначанай пазiцыi ў прылягаючых Бярозаўскiм, Камянецкiм, Кобрынскiм раёнах. У канцавых адкрытых складах этымалагiчны ***о** захаваўся ва ўсiх гаворках: *дз’áдз’ко, д’áд’ко, бáц’ко, бáт’ко*.

У новых закрытых складах пад нацiскам былы гук ***о** вымаўляецца ў гаворках паўночнай, заходняй i часткова цэнтральнай частак даследуемага рэгiёна: *воз, кон’, стог*.

Галосны **[о]** на месцы ***ь** ў спалучэннi ***tьrt** вымаўляецца толькi ў гаворках паўночнай часткi Верхняга Над’ясельдзя, акрамя гаворак вв. Залéскi Бор, Гýта, Ласасiн (Палешукi), Вiтараж: *м’óрзлы, цв’óрды*.

На месцы паслянацiскнога галоснага ***е** ў словах ‘бераг’, ‘вечар’ гук **[о]** зафiксаваны ў гаворках цэнтральнай, паўднёва-ўсходняй i паўднёва-заходняй частак рэгiёна, а таксама на поўначы ў гаворках вв. Ласасiн (Палешукi) i Вiтараж: *в’éчор, вэ́чор, б’éрог, бэ́рог*.

У слове ‘авёс’ галосны гук **[о]** на месцы ***е** вымаўляецца ў гаворках практычна на ўсёй даследуемай тэрыторыi, акрамя ўскраiнных гаворак паўднёвага захаду i невялiкага арэала на паўночным усходзе рэгiёна: *ав’óс, авйóс, ов’óс, овйóс*.

У слове ‘мёд’ **[о]** адзначаны ў гаворках паўночнай часткi вывучаемай тэрыторыi, акрамя гаворак в. Ласасiн (Палешукi) i в. Вiтараж: *м’од*.

У прыназоўнiку-прыстаўцы ***пад***, ***пад-*** галосны **[о]** вымаўляецца ў гаворках пераважна цэнтральнай i паўднёва-ўсходняй частак рэгiёна, на поўначы – у маўленнi жыхароў в. Ласасiн (Палешукi) i в. Вiтараж: *под лáўкойу, подн’алá*.

**Дыфтонг [уо].** Вымаўляецца працяжна. Адзначаны на месцы этымалагiчнага ***о** ў новых закрытых складах пад нацiскам у гаворках цэнтральнай i паўднёва-ўсходняй частак даследуемага рэгiёна, а таксама на поўначы ў гаворцы жыхароў в. Ласасiн (Палешукi): *вуоз, куон’, стуог*.

**Галосны у.** Этымалагiчны гук **[у]** захаваўся ва ўсiх гаворках: *суп, кусóк, капýста*.

Галосны **[у]** вымаўляецца ў новых закрытых складах пад нацiскам на месцы былога ***о** ў некаторых гаворках на паўднёвым захадзе Пружанскага раёна: *вуз, кун’, стуг, вун*.

У даследуемых гаворках на паўднёвым захадзе рэгiёна галосны **[у]** зафiксаваны спарадычна на месцы ***а** ў слове ‘авёс’: *увэ́с*.

Галосны **[у]** вымаўляецца ва ўсiх паўднёва-заходнiх гаворках у прыназоўнiку-прыстаўцы ***пад, пад-***: *пуд лáвкойу, пудн’алá*.

У некаторых гаворках на паўднёвым захадзе даследуемага рэгiёна галосны **[у]** вымаўляецца ў слове ‘многа’: *мнýго*.

**Галосны е.** Галосны **[е]** ўласцiвы ўсiм гаворкам даследуемага рэгiёна. Але ў розных гаворках пераход галоснага адбыўся па-рознаму. На месцы этымалагiчнага ***е** i былога ***ѣ** ў першым пераднацiскным складзе пасля губных зычных ён паслядоўна захоўваецца ў гаворках цэнтральнай i паўднёва-ўсходняй частак рэгiёна: *м’ешóк, в’едрó, п’есóк, мэшóк, вэдрó, пэсóк*. У адзначаных гаворках **[е]** вымаўляецца таксама на месцы ***е** ў першым пераднацiскным складзе пасля пярэднеязычных ***з**, ***с**, ***д**, ***т**: *з’емл’á, с’естрá, зэмл’á, сэстрá*.

ПолесГУ

На месцы ***е*** ў першым пераднаціскным складзе пасля ***н*** **[е]** вымаўляецца ў  гаворках цэнтральнай (часткова), паўднёва-ўсходняй, паўночнай (часткова ў заходняй зоне) частак вывучаемага рэгіёна, а таксама ў маўленні жыхароў вв. Брады́ і Шчарчо́ва на паўднёвым захадзе Пружанскага раёна: *н'ема́, н'е зна́йу, нэма́, нэ зна́йу*.

Галосны **[е]** на месцы націскнога ***Ѣ** вымаўляецца ў гаворках паўночнай, заходняй і часткова цэнтральнай частак Верхняга Над'ясельдзя: *л'ес, л'е́то, с'е́но*.

Галосны **[е]** на месцы ***ь** ў спалучэнні ***tьrt** вымаўляецца амаль ва ўсіх гаворках, акрамя гаворак паўночнай часткі рэгіёна: *мэ́рзлы, твэ́рды, м'е́рзлы, цв'е́рды*.

На месцы этымалагічнага ***ь** ў паслянаціскных складах пасля мяккіх зычных галосны **[е]** вымаўляецца ва ўсіх гаворках: *хло́п'ец, хло́п'ец', па́л'ец, па́л'ец'*.

У многіх гаворках, у прыватнасці цэнтральнай, паўднёва-ўсходняй і паўднёва-заходняй частак даследуемага рэгіёна **[е]** вымаўляецца на месцы этымалагічнага ***ę** ў ненаціскных складах: *зл'ека́ўса, гл'едз'е́ў, за́ец*.

У слове 'пята' **[е]** адзначаны на месцы ***ę** ў першым пераднаціскным складзе ў маўленні жыхароў в. Вітараж: *пэта́*.

У словах тыпу 'вечар', 'бераг' у паслянаціскных складах гук **[е]** вымаўляецца ў гаворках захаду Верхняга Над'ясельдзя: *в'е́чэр, вэ́чэр, б'е́рэг, бэ́рэг*.

У слове 'мёд' **[е]** вымаўляецца ў гаворках амаль ўсёй тэрыторыі, за выключэннем гаворак поўначы даследуемага рэгіёна: *мэд*.

У слове 'авёс' **[е]** вымаўляецца ў некаторых гаворках паўночнага ўсходу і паўднёвага захаду рэгіёна: *ав'е́с*, *овэ́с*, *увэ́с*.

**Дыфтонг [іе].** Вымаўляецца працяжна. Дыфтонг **[іе]** на месцы націскнога ***Ѣ** вымаўляецца ў гаворках цэнтральнай і паўднёва-ўсходняй частак рэгіёна, а таксама на поўначы ў маўленні жыхароў в. Ласасі́н (Палешукі): *л'іес, л'іето, с'іено*.

**Галосны і.** Ужываецца ва ўсіх гаворках. Ранейшы ***і** захоўваецца ў большасці гаворак: *хадз'і́ц', хадз'і́ц'і, ходз'і́ц'і, м'і́ска, п'іла́, в'і́шн'а*. У гаворках на паўднёвым захадзе, а таксама на паўднёвым усходзе даследуемага рэгіёна ***і** не захаваўся, паколькі зычныя перад ім ацвярдзелі і былы гук ***і** перайшоў у **[ы]** /*ходы́ты*, *пыла́*, *вы́шн'а*/. Выключэнне складае пазіцыя пасля мяккага ***л**: *л'і́па, кол'і́*.

На месцы іншых этымалагічных галосных **[і]** ўжываецца ў пэўных пазіцыях. На месцы націскнога ***Ѣ** **[і]** вымаўляецца ў гаворках на паўднёвым захадзе Верхняга Над'ясельдзя: *л'іс, л'і́то, с'і́но*.

Як адзінкавы выпадак, адзначаецца вымаўленне гука **[і]** на месцы ***е** ў першым пераднаціскным складзе пасля пярэднеязычных ***з**, ***с** у гаворцы в. Стараво́ля: *з'імл'а́, с'істра́*.

Галосны **[і]** на месцы ***е** ў першым пераднаціскным складзе пасля ***н** вымаўляецца ў гаворках заходняй, часткова цэнтральнай і паўночна-ўсходняй частак вывучаемага рэгіёна: *н'іма́, н'і зна́йу*.

У некаторых гаворках паўднёва-заходняй часткі рэгіёна і ў маўленні жыхароў в. Вітараж **[і]** адзначаны на месцы ***о** ў новых закрытых складах пад націскам: *в'із, к'ін'*.

У спалучэннях ***гы**, ***кы**, ***хы** галосны **[і]** вымаўляецца амаль ва ўсіх гаворках даследуемага рэгіёна: *дорог'і́, дараг'і́, каро́тк'і, коро́тк'і*. У некаторых гаворках на паўднёвым захадзе вымаўляецца галосны, сярэдні паміж **[ы]** і **[і]**: *дорог·ы́$^{і}$, коро́тк·ы$^{і}$*.

Спарадычна на паўднёвым захадзе рэгіёна **[і]** адзначаны на месцы ***о** ў націскным складзе ў слове 'многа': *мн'і́го* /в. Шчарчо́ва/.

**Галосны ы.** Характэрны для ўсіх гаворак. Этымалагічны ***ы** захаваўся ва ўсіх гаворках: *сын, дым, высо́ко*.

Галосны **[ы]** на месцы былых этымалагічных галосных пашыраны ў гаворках паўднёвага захаду рэгіёна. Тут ён вымаўляецца ў наступных пазіцыях: на месцы этымалагічнага ***і** пасля этымалагічных мяккіх /паўмяккіх/ зычных, акрамя ***л**: *мы́ска, вы́шн'а, пыла́*; на месцы ***е**, ***Ѣ** ў першым пераднаціскным складзе пасля губных: *мышо́к, выдро́*; на месцы ***е** ў першым пераднаціскным складзе пасля ***н**: *ныма́, ны зна́йу*; на месцы ***е** ў першым пераднаціскным складзе пасля пярэднеязычных ***д**, ***т**, ***з**, ***с**: *зымл'а́, сыстра́* /за выключэннем н.п. Брады́, Шчарчо́ва, дзе ў адзначанай пазіцыі вымаўляецца галосны, сярэдні паміж **[ы]** і **[э]**: *зы$^{э}$мл'а́, сы$^{э}$стра́*/. У гэтых жа гаворках у слове 'пята' гук **[ы]** выступае ў пераднаціскным складзе на месцы былога ***ę**: *пыта́*.

У новых закрытых складах пад націскам на месцы ***о** вымаўляецца **[ы]** пасля пярэднеязычных, акрамя ***л** у гаворках на паўднёвым захадзе Верхняга Над'ясельдзя, а таксама на поўначы адзначанага рэгіёна ў гаворцы в. Вітараж і на поўдні  даследуемай тэрыторыі ў маўленні жыхароў в. Бо́ркі Кобрынскага раёна: *стыг*.

ПолесГУ

У слове ‘многа’ гук **[ы]** вымаўляецца ў гаворках паўднёвага захаду рэгіёна спарадычна: *мны́го*.

У прыназоўніку-прыстаўцы **пад**, **пад-** вымаўленне гука **[ы]** адзначана ў гаворцы в. Старавóля: *пыд лáўкайу, пыдн’алá*.

***Кансанантызм.*** Мяккія губныя найбольш пашыраны ў гаворках на поўначы даследуемага рэгіёна. Таксама яны характэрны для асобных гаворак у цэнтральнай і заходняй частках Пружанскага раёна. Тут губныя зычныя мяккія перад ***е** і ***Ѣ**: *б’éраг, б’éрог, б’éрэг, п’асóк, п’есóк, м’ашóк, м’ешóк, в’аснá, в’еснá*. Носьбітамі гаворкі г.п. Шарашóва губныя зычныя ў асобных словах вымаўляюцца перад ***е** і ***Ѣ** ў націскным складзе цвёрда, у ненаціскным – мякка: *бэ́рэг, п’есóк*. У гаворках у цэнтры, на паўднёвым усходзе, паўднёвым захадзе і большасці гаворак на захадзе рэгіёна ў адзначанай пазіцыі **[б]**, **[п]**, **[м]**, **[в]** цвёрдыя: *бэ́раг, бэ́рог, бэ́рэг, пасóк, пысóк, пэсóк, машóк, мышóк, мэшóк, васнá, выснá, вэснá*.

Перад этымалагічным ***і** губныя мяккія амаль ва ўсіх гаворках даследуемага рэгіёна: *в’íшн’а, м’íска, п’ілá*. У маўленні жыхароў некаторых населеных пунктаў /н.п. Вітараж, Обеч, Залýжжа, Брады́/ губныя зычныя перад ***і** паўмяккія: *в·ы$^{і}$шн’а, м·ы$^{і}$ска, п·ы$^{і}$лá*. У гаворках на паўднёвым захадзе Верхняга Над’ясельдзя губныя зычныя цвёрдыя: *вы́шн’а, мы́ска, пылá*.

Мяккі **[м’]** перад этымалагічным галосным ***ę** захаваўся ў гаворках паўночнага ўсходу, у некаторых гаворках захаду даследуемага рэгіёна і ў гаворках в. Дабýчын, г.п. Шарашóва цэнтральнай часткі Пружанскага раёна і в. Бóркі Кобрынскага раёна: *м’áсо, м’áта*. Большасці гаворкам, у прыватнасці ў цэнтры, на захадзе, на паўднёвым ўсходзе, на паўднёвым захадзе (часткова) і некаторым гаворкам на паўночным усходзе даследуемага рэгіёна характэрна цвёрдае вымаўленне губных зычных з зычным **[й]** перад этымалагічным націскным гукам ***ę**: *мйáсо, мйáта*. У некаторых гаворках на паўднёвым захадзе і паўднёвым усходзе даследуемай тэрыторыі пасля губнога **[м]** вымаўляецца **[н]**: *мн’áсо, мн’áта*.

Зычны **[л]** перад этымалагічнымі ***е**, ***і** вымаўляецца мякка ва ўсіх гаворках: *пóл’е, л’íпа, кал’í, кол’í*.

Пярэднеязычныя зычныя, акрамя ***л**, перад рэфлексамі мінулага галоснага ***е** мяккія на паўночным усходзе, захадзе і ў некаторых гаворках у цэнтры даследуемага рэгіёна: *з’амл’á, з’емл’á, з’імл’á, с’алó, с’елó, с’ілó*. Цвёрда гэтыя зычныя вымаўляюцца ў цэнтральнай, паўднёва-ўсходняй і паўднёва-заходняй частках рэгіёна: *зэмл’á, зымл’á, сэлó, сылó*.

Перад этымалагічным ***і** зычныя ***д**, ***т**, ***з**, ***с**, ***н** мяккія амаль ва ўсіх гаворках Верхняга Над’ясельдзя: *з’імá, с’íла*. У даследуемых гаворках на паўднёвым захадзе рэгіёна дадзеныя зычныя цвёрдыя: *зымá, сы́ла*. У некаторых гаворках паўднёвага ўсходу /н.п. Вітараж, Обеч, Бóркі/, паўднёвага захаду /в. Брады/ і ў гаворцы в. Вітараж на поўначы Верхняга Над’ясельдзя гэтыя зычныя ў адзначанай пазіцыі паўмяккія: *з·ы$^{і}$мá, с·ы$^{і}$ла*.

Зычныя **[з]**, **[с]** перад наступнымі мяккімі зычнымі, акрамя заднеязычных, вымаўляюцца мякка, паўмякка і цвёрда. Мякка яны вымаўляюцца ў гаворках паўночна-ўсходняй, заходняй і ў некаторых гаворках цэнтральнай часткі рэгіёна: *с’в’ет, с’н’ег*. Паўмякка – у некаторых гаворках паўднёвага захаду і паўднёвага ўсходу вывучаемай тэрыторыі, а таксама гаворцы в. Вітараж: *с·в’ет, с·н’ег, с·в’іт, с·н’іг*. Ва ўсіх астатніх гаворках **[з]**, **[с]** цвёрдыя: *св’ет, сн’ег, св’іт, сн’іг*.

Этымалагічныя ***д**, ***т** мяккія перад рэфлексамі былога галоснага ***е** на паўночным усходзе, захадзе і ў некаторых гаворках у цэнтры рэгіёна: *дз’ен’, ідз’é, ц’еплó, ц’аплó*. Ва ўсіх астатніх даследуемых гаворках гэтыя зычныя ў адзначанай пазіцыі вымаўляюцца цвёрда: *дэн’, ідэ́, тэплó*.

Перад этымалагічным ***і** для большасці гаворак рэгіёна характэрна дзеканне-цеканне: *л’ýдз’і, ц’íхо*. У гаворках на паўднёвым захадзе і некаторых на паўднёвым усходзе Верхняга Над’ясельдзя дадзеныя зычныя цвёрдыя: *л’ýды, ты́хо*.

Што датычыцца мяккіх **[д’]**, **[т’]** у іншых пазіцыях, дык яны захаваліся толькі ў некаторых гаворках паўднёвага захаду і паўднёвага ўсходу рэгіёна.

Зычны **[д’]** у дадзеных гаворках вымаўляецца мякка перад **[е]**, **[і]**, **[а]** з былых ***ъ**, ***ь** і ***ę**: *д’ед, д’íд, д’áлка, с’ад’*. У адзінкавых гаворках паўднёвага захаду даследуемага рэгіёна зафіксавана паўмяккае вымаўленне зычнага **[д’]** у пазіцыі перад **ы$^{і}$** з былога ***ъ**: *д·ы$^{і}$д*. У асобных гаворках цэнтральнай часткі рэгіёна ва ўсіх пазіцыях, акрамя пазіцыі перад ***е**, зафіксавана вымаўленне **[д’]** з прыгукам **[з’]**: *л’ýд$^{’з}$і, д$^{’з}$ед, д$^{’з}$áлка, с’ад$^{’з}$* /вв. Смаляніца, Асятніца, Кóмлішча і інш./.

Мяккі **[т’]** захаваўся ў некаторых гаворках паўднёвага захаду і паўднёвага ўсходу даследуемага рэгіёна ў пазіцыях перад ***ь**, ***ę**: *т’áшко, пйат’*. У гэтых жа гаворках у пазіцыі перад ***Ѣ** **[т’]** вымаўляецца паўмякка: *т·ен’*.

У большасці гаворак даследуемага рэгіёна (поўнач, паўночны ўсход, захад і гаворкі цэнтральнай часткі рэгіёна) **[д]** і **[т]** у дадзеных пазіцыях перайшлі ў **[дз']**, **[ц']**: *дз'ед, дз'áлка, с'адз', ц'ен', ц'áжко, п'ац', пйац'*.

У гаворцы в. Бóркі Кобрынскага раёна ў пазіцыі перад **[е]** з былога ***Ѣ** зафіксавана цвёрдае вымаўленне **[т']**: *тэн'* .

Зычны ***н** мяккі перад рэфлексамі з мінулага ***е** на поўначы, захадзе і ў некаторых гаворках ў цэнтры рэгіёна: *н'емá*, *н'е знáйу*, *н'імá*, *н'і знáйу*. У астатніх гаворках дадзены зычны вымаўляецца цвёрда: *нэмá*, *нэ знáйу*, *нымá*, *ны знáйу*.

У былых спалучэннях ***гы**, ***кы**, ***хы** заднеязычныя захаваліся цвёрдымі толькі ў некаторых гаворках паўднёвага захаду рэгіёна /вв. Галася́ціна, Шчарчóва, Ды́мнікі/: *дорогы́, корóткы*. Паўмяккае вымаўленне **[г·]**, **[к·]**, **[х·]** зафіксавана таксама ў некаторых гаворках паўднёвага захаду Верхняга Над'ясельдзя і, як адзінкавае, на паўночным усходзе ў маўленні жыхароў в. Вітараж: *дорог·ы*$^{і}$, *коротк·ы*$^{і}$. Ва ўсіх астатніх даследуемых гаворках былыя зычныя перайшлі ў мяккія: *дараг'í, дорог'í, карóтк'і, корóтк'і*.

Цвёрдыя зычныя ***г**, ***к**, ***х** у пазіцыі перад **[е]** ў прыметніках ніякага роду адзіночнага ліку сустракаюцца ў некаторых гаворках паўднёвага захаду рэгіёна і ў гаворцы в. Вітараж: *дóвгэ, корóткэ*. У некаторых гаворках паўднёвага захаду і паўднёвага ўсходу Верхняга Над'ясельдзя зафіксавана ў акрэсленай пазіцыі паўмяккае вымаўленне дадзеных зычных: *дóўг·эе, дóвг·эе, корóтк·эе*. У гаворках у цэнтральнай і паўднёва-ўсходняй частак абследаванай тэрыторыі ў гэтай пазіцыі заднеязычныя мяккія: *дóўг'е, дóўг'ее, корóтк'е, корóтк'ее*.

Этымалагічны ***р** ва ўсіх гаворках даследуемага рэгіёна ацвярдзеў: *рэ́чка, грэх, рэ́зац'*.

Шыпячыя зычныя **[ж]**, **[ч]**, **[ш]** ацвярдзелі амаль ва ўсіх даследуемых гаворках: *шáпка, жáба*. Шыпячы ***ж** вымаўляецца мякка ў некаторых гаворках паўднёвага захаду рэгіёна ў словаформе 'на мяжы': *на мэж'í, на мыж'í*. У асобных гаворках паўднёвага захаду і паўднёвага ўсходу Верхняга Над'ясельдзя ён спарадычна вымаўляецца паўмякка: *на мэж·э*$^{е}$, *на мыж·э*$^{е}$, *на мэж·ы*$^{і}$, *на мыж·ы*$^{і}$.

Мяккасць зычнага ***ц** разглядаецца на прыкладзе слова 'хлопец', 'хлопцы'. У большасці гаворак зычны ***ц** ацвярдзеў: *хлóпэц, хлóпцы*. Але ў гаворках паўднёвага захаду рэгіёна ***ц** вымаўляецца цвёрда і паўмякка: *хлóпэц, хлóпц·і*$^{ы}$. У гаворках в. Вітараж Пружанскага раёна і в. Бóркі Кобрынскага раёна зафіксавана вымаўленне мяккага ***ц**: *хлóпц'і, хлóп'ец'*.

Зычны ***в**, які паходзіць з ***в**, ***л**, у даследуемых гаворках даў рэфлексы «**ў**» і губна-зубны /**в**/. Рэфлекс «**ў**» зафіксаваны ў пераважнай большасці гаворак рэгіёна: *куп'íў, купы́ў, лáўка*; губна-зубны /**в**/ у гаворках паўднёвага захаду Верхняга Над'ясельдзя, в. Вітараж Пружанскага раёна і в. Бóркі Кобрынскага раёна: *купы́в, лáвка*.

Асіміляцыя па глухасці адзначана практычна ва ўсіх даследуемых гаворках: *кáска, загáтка*.

На месцы былога спалучэння «**мяккі зычны + ьј**» у становішчы паміж галоснымі няма паслядоўнасці ў вымаўленні зычных. У слове 'зелле' гук **[л]** вымаўляецца ў адзначанай пазіцыі падоўжана ў некаторых гаворках паўднёвага захаду, паўднёвага ўсходу, спарадычна ў гаворках цэнтральнай і паўночна-ўсходняй частак рэгіёна: *з'éлл'е*, *з'éлл'о*, *з'íлл'е*, *зы́лл'е*. У астатніх гаворках або захавалася спалучэнне «**мяккі зычны + ьј**» або вымаўляецца адзін мяккі гук **[л']**: *з'éл'јe, з'éл'јo, з'íл'јe, з'éл'е, з'éл'о, з'íл'е*. У слове 'насенне' падоўжаныя зычныя захаваліся практычна ва ўсіх абследаваных населеных пунктах: *нас'éнн'е, нас'éнн'о, нас'í*$^{ы}$*нн'е, насы́нн'е*. У чатырох вёсках /н.п. Мурáва, Навасёлкі, Ліхасéльцы, Баравікí/ вымаўляецца адзін мяккі гук **[н']**: *нас'éн'е*.

Што датычыцца пратэтычных зычных **[в]** і **[г]**, то яны характэрны многім гаворкам. Аднак пашыранасць гэтых зычных у гаворках дадзенага рэгіёна неаднолькавая. Пратэтычны **[в]** у словах 'вока', 'возера' вымаўляецца толькі ў гаворках на паўночным усходзе Верхняга Над'ясельдзя: *вóко, вóз'еро*. Ён жа мае месца ў слове 'ануча', дзе спарадычна адзначаецца ў асобных гаворках на паўднёвым захадзе адзначанага рэгіёна: *вну́ча*. Значна шырэй адзначаецца вымаўленне **[г]**. Прыстаўны **[г]** у словах 'араць', 'ануча' пашыраны на поўначы, на захадзе і спарадычна на паўднёвым усходзе даследуемай тэрыторыі: *гарáц', гарáц'і, горáц'і, горáты, гану́ча, гону́ча*. Акрамя таго, у асобных гаворках на паўднёвым усходзе /н.п. Óбеч, Залу́жжа/ рэгіёна пратэтычны **[г]** ужываецца ў словах 'вока', 'возера': *гóко, гóз'еро*. Тэрыторыі пашырэння форм з прыстаўнымі гукамі супрацьстаўляецца кантынуум, дзе прыстаўныя **[в]**, **[г]** наогул не адзначаюцца. Словы без пратэтычных гукаў ужываюцца найчасцей у гаворках цэнтральнай часткі рэгіёна: *óко, óз'еро, орáц'і, ону́ча*.

ПолесГУ

Займеннікі **ён**, **яна**, **яно**, **яны** вымаўляюцца з пратэтычным **[в]** у большасці гаворак: *вон, вуон, вун, в’ін, воná, вонó, воны́, ваná, ванó, ваны́, вуná, вунó, вуны́*. Выключэнне складаюць гаворкі поўначы Верхняга Над’ясельдзя: *йон, йанá, йанó, йаны́*.

Цікавы выпадак у даследуемым рэгіёне назіраецца пры рэалізацыі зычнага **[г]** у слове ‘éздзіць’. У большасці гаворак **[з]** захоўваецца: *éздз’іц’, éздз’іц’і, éзд$^{з}$іц’і, éздыты, íздыты*. Аднак на паўночным усходзе рэгіёна існуе мікраарэал /вв. Таўцвілы, Калазýбы, Éськаўцы/, дзе зычны **[з]** перайшоў у зычны **[г]**: *éгдз’іц’*.

## ВЫВАДЫ

Для даследуемых гаворак у цэнтральнай частцы, на ўсходзе і на паўднёвым усходзе Верхняга Над’ясельдзя характэрны васьміфанемны склад галосных: [і], [ы], [е], [а], [о], [у], [іе], [уо], для гаворак поўначы, захаду і паўднёвага захаду даследуемай тэрыторыі – шасціфанемны склад галосных: [і], [ы], [е], [а], [о], [у].

Кансанантызм даследуемых гаворак характарызуецца наяўнасцю агульных і спецыфічных, рэгіянальных асаблівасцей. Да агульных асаблівасцей адносяцца наяўнасць звонкай цвёрдай [дж], пратэтычных [в], [г], падоўжаных мяккіх [з’], [л’], [н’], [с’] і зацвярдзелых [ж], [ч], [ш]. Спецыфічныя, рэгіянальныя асаблівасці выяўляюцца ў адрозненні па цвёрдасці і мяккасці, глухасці і звонкасці зычных, наяўнасці або адсутнасці мяккіх афрыкат [дз’], [ц’] і губнога [ў] /нескладовага/.

## ЛІТАРАТУРА


1. Атлас української мови. Волинь, Наддністрянщина, Закарпаття і суміжні землі. – Київ: Навукова думка, 1988. – Т.2. – 518 с.
2. Босак, А.А. Атлас гаворак Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці і сумежжа (Верхняга Над’ясельдзя). Фанетыка і марфалогія / А.А. Босак, В.М. Босак. – Мінск: ІВЦ Мінфіна, 2005. – 94 с.
3. Босак, А.А. Дыферэнцыяцыя і арэальныя сувязі гаворак Верхяга Над’ясельдзя: дыс. … канд. філ. навук: 10.02.01 / А.А. Босак; Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі. – Мінск, 2006. – 257 с.
4. Босак, А.А. Народныя гаворкі Верхняга Над’ясельдзя / А.А. Босак, В.М. Босак // Веснік Палескага дзяржаўнага універсітэта. Серыя грамадскіх і гуманітарных навук. – 2008. – № 1. – С. 3 – 7.
5. Клімчук, Ф.Д. Гаворкі Заходняга Палесся. Фанетычны нарыс / Ф.Д. Клімчук. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 127 с.
6. Крывіцкі, А.А. Дыялекталогія беларускай мовы / А.А. Крывіцкі. – Мінск: Вышэйшая школа, 2003. – 294 с.
7. Леванцэвіч, Л.В. Лінгвагеаграфічная групоўка гаворак Бярозаўскага раёна: дыс. … канд. філ. навук: 10.02.01 / Л.В. Леванцэвіч; Інстытут мовазнаўства АН Беларусі. – Мінск, 1996. – 291 с.
8. Atlas gwar wschodniosłowiańskich Białostocczyzny. – Wrocław, Warszawa. – 1980–1999.


## PHONETIC PARTICULARITIES OF SUBDIALECTS OF VERKHNYAYE NADYASELDZE


***A.A. BOSAK, V.M. BOSAK***



***Summary***

The main phonetic particularities have been presented in this edition as well as the areals and borders of subdialects of Verkhnyaye Nadyaseldze (Pruzhany district of Brest region and its boundary territory) have been determined.



*Паступіў у рэдакцыю 8 ліпеня 2008 г.*


ПолесГУ